№ 29 Ausgabe B.

ГОМАН

Цэна с перэсылкай і дастаукай да хаты:

на 1 год—4 м. 80 фэн., на ½ году—2 м. 40 ф., на 3 месяцы—1 м. 20 ф., на 1 мес.—40 фэн.

Беларуская Віленская часопісь

выходзіць два разы у тыдзень: у аўторкі і пятніцы.

Адрэс рэдакціі: Вільня, Віленская 33.
Адрэс адміністрациі і экспэдыціі:
М. Стэфанская 23.

Цэна абвестак:

на 4-ай старане за радок дробнымі літэрамі — 25 фэніг.; дробные абвесткі— па 5 фэн за слова. Абвесткі аб сьмерці — 60 фэн. за лінейку дробн. друкам.

№ 29 (225). Год III. Вільня, 9 красавіка 1918 г. Цэна 5 фэн. (3 кап.)

8 красавіка.

Заходні тэатр:

На фронці наабапал Соммы толькі артылерыйскіе бітвы. У лесі Ангар адбіто с цяжкімі стратамі англіцкае, а пры Грівэнь—францускае наступленьне. На палудзенным беразі Уазы ворагі ў начы с 6 на 7 красавіка ачысьцілі часць сваіх пазыцій між Бішанкур і Барісі. Учора мы выкінулі ворагаў с П'ермант і Фолянбрэ на заходні бераг Айель. На ўсходнім краю лесу Курсі мы наступалі да Вэрнэй. Чысло палонных больш за 2.000. Пад Вэрдэнам у вечары артылерыйская бітва.

Ротмістр барон ф. Ріхтгофэн даўшоў сваіх 77 і 78 пабед.

ПЕЦЯРБУРГ (Рэўтэр). Маніфэстрады народных камісараў вінаваціць Японію ў жаданьні загубіць народную рэспубліку і заўладаць Сібірам. Японія абвешчаецца за сьмяротнага ворага Расеі. Расейскі ўрад трэбуе ад саюзьнікаў аб'ясьненьня і папярэджывае, што іх адказ адаб'ецца на ўсей заграні чнай палітыцэ Расеі.

ПЕЦЯРБУРГ. Рада народных камісараў апавешчае сваю пастанову пакінуць без ніякай увагі высадку немцаў у Фінляндзіі, пакуль іх опэрацііі ня выйдуць за межы гэтай незалежнай старонкі.

ПЕЦЯРБУРГ. „Наш Век" наказывае з Масквы, што ўрад згодзіўся на апавешчэньне татарскай рэспублікі, каторая будзе ў саюзе з урадам саветаў.

МАСКВА (П.Т.А.). 4.IV. Урад паслаў украінскаму ураду паведамленьне аб згодзі пачаць міравые перэгаворы з украінай; ён прэдлагае пачаць перэгаворы у Смаленску. Разам с тым савецкі урад пратэстуе проці заявы, быццым між Расеей і Украінай ішла вайна. Барацьба йдзе выключна між дзьвема партыямі украінскага народу, і гутарка можэ ісьці толькі аб гарачых сымпатыях работнікаў Расеі да работнікаў і селян Украіны.

ПЕЦЯРБУРГ. «Ізвестія» наказываюць, што між урадам і амэрыканскім агентам Джонсонам ідуць перэгаворы аб прадажы Камчаткі.

МАСКВА (П.Т.А.). Пацьверджаюцца весткі аб назначэньні Еффэ за пасла ў Бэрлін і Каменева ў Вену.

РОТТЭРДАМ. У бэльгійскіх урадовых кругах занепакоены доляй бэльгійскай арміі у прыпадку адступленьня англічан на палудзень.

ЛОНДОН. Лёрд Норскліф быў у міністра-прэзыдэнта, Льлёйда Джорджа, і ад імі патрыотаў дамагаўся адстаўкі рады генэралаў, с прычыны таго, што левае крыло англіцкай арміі зусім ня споўніло ускладаных на яго надзей. Фэльдмаршалак Гэг зусім не ждаў наступленьня.

Работнікі востра выступаюць проці новых набораў.

Ходзяць чуткі, што Льлёйд Джордж прынцыпіальна згодзіўся зрабіць перамены ў ваеннай камандзі.

ПАРЫЖ (Гавас). Урадова. 7.IV. Абстрэл Парыжа з дальнабойных гармат трываў і 6 красавіка. Ранены 3 асобы.

БЭРЛІН. Новые ўдачы нямецкіх падводных лодак навакол Англіі: 18.000 тонн. Часць груза становіў транспорт каней дзеля Франціі.

БЭРЛІН. Агенцтво Гавас апавешчае:

Францускае міністэрства апавешчае гэткую заяву: «калі Клемансо прыняў упраўленьне, дык выявілося, што, на жаданьне Аўстры, у Швэйцары адбываліся перэгаворы між графам Рэвэртэра, асабістым прыяцелем аўстраяцкага імпэратара, і маёрам францускага генэральнага штабу, Арман, каторы быў послан дзеля гэтага б. францускім прэм'ер міністрам.

Клемансо лічыў, што майор Арман можэ атрымаць карысные ведамасьці, і не лічыў магчымым узяць на сябе адказ за перарыў гэтых перэгавораў. На жаданьне графа Рэвэртэра Арман гэтак не раз езьдзіў у Швэйцарыю. Клемансо пры начальніку майора даў яму інструкцію: слухаць і нічога не гаварыць. 25 лютага Рэвэртэра аддаў Арману заяву, каторая пачыналася гэтак: „У жніўні 1917 году пачаліся перэгаворы, каб атрымаць ад францускага ураду міравые прэдлажэньня дзеля Аўстры, каторые Аўстрыя магла-бы паддзержаць перад бэрлінскім урадам".

Беларуская работа за кордонам.

(З мэморыялу беларускіх дэлегатаў на мірные перэгаворы у Бярэсьці: А. Цьвікевіча і Рака-Міхайлоускага 25.II.1918 году).

Пасьля заняцьця Вільні нямецкім войскам беларуская работа ў другой часьці краю на момэнт прыпынілася. Старых працаўнікоў доля параскідала па ўсей Расеі, а тые, што асталіся на сваей зямлі, утраціўшы зьвязь з даўнейшым віленскім кіраўнічым цэнтрам, сперша з вялікай труднасьцю знаходзілі сілы дзеля організаціі новага цэнтру. Да таго край залівалі мільёны панаехаўшых сюды чужых людзей, каторые захапілі ў свае рукі ўсё тутэйшае жыцьцё. Аднак, беларуская работа ў тэй ці іншай форме трывала далей. У другім годзі вайны яна выявілася ў паджэньні камітэтаў уцекачоў, таварыств помачы пацярпеўшым ад вайны і т. п.

З нэзвычайнай сілай і размахам развіваецца нацыянальна палітычны рух у Беларусі ад першых дзён рэвалюціі ў лютым 1917 году. Ужо ў марцы адбыўся людны з'езд беларускіх грамадзкіх дзеячаў і быў утворэн „Беларускі Нацыянальны Камітэт". Аднак, склад гэтага камітэту аказаўся не зусім удачны, і з гэтай прычыны ён быў скора заменен новай організаціей — „Цэнтральнай Радай беларускіх організацій і партый", каторая адгэтуль станавіла цэнтр беларускага нацыянальна-палітычнага руху і кіравала гэтым рухам. За шэсць месяцаў рэвалюціі думка аб нацыянальным адраджэньні і палітычным самаазначэньні Беларусі безупынна шырылася і ўзмацоўвалася на чысьленых з'ездах, сходах і мітынгах. Рух пайшоў па ўсенькім краю і палажыў сваё клеймо на рабоці ўсіх дэмократычных устаноў Беларусі. Ад верасьня — пасьля трэйцяй сэссіі „Цэнтральнай Рады беларускіх організацій і партый" — выясьнілася патрэба утварэньня дзержаўна-праўнай установы, каторая ўзялабы-бы ў свае рукі ўсю ўласьць у краю і апавесьцілабы Беларускую дэмократычную Рэспубліку. Дзеля гэтай мэты былі склікэны беларускіе з'езды армій усіх фронтаў: Заходняга ў Менску (18-24 кастрычніка), Паўночнага — ў Вітэбску (15—20 лістапада), Румынскага — ў Одэссі (3-8 сьнежня) і Палудзенна-Заходняга — ў Кіеві (17-22 сьнежня), — далей два з'езды беларускіх уцекачоў у Маскве і адзін у Менску, з'езды вучыцельскіх і іншых грамадзкіх організацій у Смаленску, Вітэбску, Полацку і іншых местох. Рэзультататам гэтых з'ездаў было утварэньне „Вялікай Беларускай Рады" і „Беларускай Цэнтральнай Вайсковай Рады" і скліканьне установчага беларускага нацыянальнага конгрэсу ў Менску 18 снежня 1917 году.

Усебеларускі конгрэс складаўся з дэпутатаў ад валасных селянскіх земств і камітэтаў усяе этнографічнае Беларусі, паветовых і губэрскіх земств, местовых рад, рад рабочых і салдацкіх дэпутатаў, вайсковых організацій з усіх фронтаў і тылу, саюзаў і камітэтаў уцекачоў, коопэратываў, прафэсмональных і іншых організацій Беларусі і ўсіх яе палітычных партый — чыслом 1167 дэпутатаў с правам пастанаўляючага голасу і 705 — с правам дарадчага голасу.

Гэты конгрэсс, выяўляючы найвышэйшую, суверэнную волю беларускага народу, пастановай 18 сьнежня 1917 г. зацьвярдзіў устанаўленьне рэспубліканскага дэмократычнага ладу ў этнографічных межах Беларускай зямлі і выбраў с-паміж сябе найвышэйшаю ўласьць Беларусі—„Раду Беларускага Конгрэсу", каторая ад сябе спаўніцельную ўласьць на ўвесь край аддала спаўніцельнаму камітэту з'езду — Радзе народных міністраў. Аднвчасна з гэтым конгрэс развязаў доўгі сьцяг спраў, зьвязаных с соцыяльна-палітычным устройствам Беларусі, і загадаў Радзе Конгрэсу правясьці ў жыцьцё патрэбные рэформы.

Пасьля прыняцьця гэтых пастаноў прэдстаўнікі большэвіцкай уласьці ў Менску, карыстаючы з нябытнасьці ў горадзі беларускіх войск, аружнай сілай разагналі усебеларускі конгрэс. Ня гледзячы на гэта, Рада прыступіла да спаўненьня узложэных на яе павіннасьцей і — побач з другімі установамі — выбрала дэлегацію на мірные перэгаворы у Брэст-Літоўску.

За кароткі час сваей працы Рада атрымала чысьленые заявы аб прызнаньні яе за ядыную ўласць у Беларусі,—ў тым ліку ад Украінскай Народнай Рэспублікі, Туркестану і інш. Аднак, праца над выработкай конституціі Беларускай Рэспублікі развівацца далей не магла с прычыны вострай кольлізіі між Радай і большэвіцкімі ўласьцямі, каторые не хацелі уступаць свайго мейсца беларусам. Перад Радай узнялося грознае пытаньне

аб аружнай барацьбе з большэвікамі. Дзеля гэтага спаўнiцельны камітэт Рады маніўся завязаць зносіны з Украінскай Рэспублікай праз сваёго камісара пры Украінскім Генэральным Сэкрэтарыяце і злучыць аружные сілы дзеля супольнага змагання. Здарыўшыеся пасьля гэтага прыпадкі на Украіне і ўрэшці прыказ вярхоўнага главнакамандуючага Крыленкі перашкодзілі выпаўненьню гэтага пляну.

Прынімаючы пад увагу, што 10-мільённы беларускі народ у сваей гістарычнай мінуўшчыне ўжо тварыў знаменітые формы дзержаўнага ладу і што с палітычнага па гляду ён роўнацэнны вялікарусам і украінцам, беларускі рух кіруецца да утварэньня такіх форм гасударственнага быту Беларусі, пры каторых развіцьце асобеннасьцей беларускага народу было бы забаспечэно ў поўнай меры. З гэтай прычыны побач з думкай аб Беларускай Рэспубліцэ ў межах расейскай фэдэрацыі узнаўся рух да поўнай незалежнасьці Беларусі. Апошні кірунак за апошні час пачаў асабліва шыбка узрастаць затым, што большэвізм, каторы нішчыць у Расеі апошніе асновы грамадзкага ладу, гатоў перакінуцца і ў Беларусь. Каб забаспечыцца ад гэтага, беларускіе ўласьці крок за крокам пераходзяць на дарогу да поўнага дзержаўнага сэпаратызму (аддзяленьня ад Расеі). Беларусы маюць тут прыклад Украінскай Народнай Рэспублікі, с каторай беларусаў злучае ня толькі братняя еднасць у барацьбе за свае дзержаўные правы, але і экономічные зьвязі. І с поўнай верай можна сказаць, што пры захаваньні еднасьці ўсіх зямель беларускага народу ў яго этнографічных межах і пры забаспечэньні беларусам свабоды самаазначэньня далейшая доля абедзьвых рэспублік будзе такая-ж самая.

Аб даўгі Расеі.

Аддзяленьне ад Расейскай дзержавы зямель, каторые некалі былі паняволены ёю і цяпер адна за адной здабываюць сабе ізноў незалежны быт, ставіне на чародзі пытаньне: як будзе з выплатай даўгоў, каторые Расея зрабіла на вядзеньне вайны, выступаючы ад імі ўсіх прыслухаючых ёй народаў?

Ясна тут адно: што ніводзін народ і ніводзін край, вызваліўшыйся цяпер с-пад расейскага панаваньня, ня лічыць сябе абвязаным адказываць за даўгі наволіўшай іх дзержавы. У прынцыпе з гэтым згаджаецца нават і сама Расея. У брэскім трактаце ясна гаворыцца, што для зямель, уступленых Расеей, не вынікаюць ніякіе павіннасьці с прычыны іх ранейшае прыналежнасьці да Расейскай дзержавы. А раз гэта прызнаецца у адносінах да уступленых расейцамі тэрыторый, дык трэба прызнаць і ў адносінах да тых зямель і народаў, каторые самі апавесьцілі аддзяленьне сваё ад Расеі.

Паскольку заходняя часць Беларусі, ад каторай Расея ў Брэсьці адрэклася, гэтым самым аказалася, звольненай ад усіх расейскіх даўгоў пастольку усходняя Беларусь, абвешчаючы сваю незалежнасць, сама звольніла сябе ад павіннасьці плаціць даўгі Расеі, каторых на ўсю Беларусь (паводлуг падрахунку, каторага мы не мелі магчымасьці праверыць) прыпадае каля 7 мільярдаў.

Аднак, проці прызнанага Расеей прынцыпа выступаюць тые дзержавы, каторые ад пачатку вайны напазычалі Расеі шмат грошы. Гэтак, англіцкі і француcкі урады апавешчаюць, што „грашавые абвязацельствы расейскага ўраду павінны удзержаць сваю моц. Яны абвязываюць або будуць абвязываць новые дзержавы, эвэнтуальна — комплекс новых дзержаў, якіе маюць у будучыні замяніць Расею“.

Крыху іначай ставіне гэту справу Японія. Ей ніякага дзела німа да таго, як Расея развязывае пытаньне аб выплаце даўгоў. Як вы явілося, апавешчэнае выступленьне Японіі ў Сібіры ня мело ані палітычных, ані ваенных мэт. Усе гутаркі францускіх газэт аб прычынах японскага выступленьня аказалася зусім пустымі: Японія не збірацца ані граіць немцам з усходу, ані прашкодзіць ім скарыстаць з запасаў збожжа ў Сібіры, а толькі хочэ мець залог за расейскіе даўгі, якіх сучасны ўрад наагул не збіраецца плаціць.

Як бы там ні было, мы бачым, што Англія і Франція — гэта натуральные ворагі вызваленьня с-пад Расеі паняволеных ею народаў, бо гэта грозіць інтэрэсам англіцкага і францускага капіталізму, аслабляючы выплатную сілу Расейскай дзержавы. Аб гэтым павінны добра падумаць тые, хто ўсе свае надзеі дагэтуль ускладаў на саюзные з Расеей дзержавы...

Г. Б.

„Гісторыя Польшчы“ у народных і местовых школах у Беларусі.

Каліб краі маглі пахваляцца ненормальнасьцямі свайго ўнутраннага жыцьця, дык якуюж славу павінна былаб прыдбаць наша мілая Беларусь, край уселякіх ненормальнасьцей, неспатыканых ндзе! Возьмем дзеля прыкладу тутэйшые народные школы і напісаньне дзіцячых галоў мудрасьцю „Гісторыі Польшчы“. Беларускім і літоўскім дзецям, між каторымі можна знайсьці толькі зусім невялічкі процант дзяцей болей або меней польскага паходжаньня, на роднай зямлі Беларускай народнай і местовая школа вучыць дзяцей на лекціях гісторыі аб тым, што рабілася недзе пад Гоплам, у Гнезьне, Кракаве, Варшаве... Навучаюць дзетак аб Мешках і Лешках, каторые з Беларусьсю, бацькаўшчынай вучняў, нічога супольнага не маюць. Прад дзіцячымі вачыма паказваюцца пазбаўленые ўселякай гістарычнай вартасьці — па Корзону — абразкі князёў і каралёў польскіх работы Матэйкі. Гісторыя Польшчы апаведае нашым дзецям аб войнах, у каторых іх дзяды ніякага ўчасьця не прынімалі і ў каторых не былі нічым заінтэрэсованы; аб местох, закладаных чужынцамі і для чужынцаў; аб долі і нядолі чужых нам народаў, аб чужацкіх звычаях і абычаях... Ціж гэта не найвялікшая ненормальнасць — выклад усяго гэтага ў пачатковай школе на Беларусі? Ці не парушае самых элемэнтарных асноў педагогікі вучэньне дзяцей у пачатковых школах перш за ўсё гісторыі чужога краю і чужога народу, — Польшчы і Палякоў? Не аслабліе сілы гэтага закіду і тлумачэньне, бытцым выклад польскай гісторыі да Ягайлы гэта толькі ўступленьне (sic!) да сапраўднай гісторыі Беларускага краю, аніж тое, што ад гэтага гістарычнага момэнту бытцым то роўнамерна выкладаецца також і гісторыя нашай зямлі. Выклад раўнуючый, сьпатэтычный можэ мець мейсцо хіба толькі ў вышэйшых школах, а прынамсі ў старшых клясах, сярэдніх школ, але ніколі не ў пачатковых школах. Мо' хто на гэта папрабуе сказаць: алеж Польшча дала нам рэлігію, культуру, штукарства... Ну, каліб гэта нават і было так, дык, апіраючыся на гэткіх асновах, трэбалоб пачынаць навуку гісторыі ад мінуўшчыны Рыму, скуль рэлігія і культура разыходзілася па ўсенькім сьвеці, і ад Грэціі, калыскі ўселякага мастацтва!

Якоеж дзіва, што навучаньне „Гісторыі Польшчы“ ў народных школах на Беларусі мае толькі адзін бясспорны рэзультат: выкрыўляе дзіцячы розум, фальшуе ход іх далейшага развіцьця і зьбівае людзей з дарогі, сулячы ім многа бед. Бо гэтак узгадоўваюцца людзі, каторые будуць сябе чужымі на бацькаўскай зямлі і між сваімі землякамі, а затое ўздыхаюць да Кракава і Варшавы, куды, аднак, варункі жыцьця не пазволяць ім перэбрацца, — дый нават гэткіе людзі зусім ня думаюць перэбірацца за Буг! Гэтак маемо тут відавочнае раздваеньне чэлавечай сьвядомасьці, ні для чаго непатрэбны ўнутраны разлад. І гэта — дзякуючы народнай школе!

Cui bono? (каму з гэтага карысць?)

А як стаіць справа з гісторыей Літвы — той вялікай Літвы, што папраўдзі сягала „ад мора да мора“? Ў найлепшым здарэньні пад не даецца колькі-надцаць страніцак, дый там бадай с кожнага слова прабіваецца тэндэнцыйнасць. Вось, і ўсё. Гэтак зусім заціраецца памяць аб тым, што тая вялікая Літва, абнімаўшая як Літоўскіе, так і Беларускіе землі, была некалі незалежнай дзержавай, quod est demonstrandum est. Ані гісторыя спрадвечных часаў краю, ані пэрыод будаваньня яе, ані гісторыя князёў, ані закладаньне і развіцьце мест, ані работа цэнтраў прасьветы, кляштараў, школ, друкарэнь і гісторыя штукарства (касьцёлы, замкі), ані Вострая Брама, Жыровіцы, Шыдлово, ані ўсё ўнутраннае гасударственнае жыцьцё, гэткае непадобнае да жыцьця Польшчы, не знаходзяць для сябе належнага мейсца ў падобным выкладзе гісторыі, ды нават аб іх перэважна—сьвядома ці несьвядома, гэта не важна,— замаўчываюць і міма іх праходзяць моўчкі. А мінуўшчына беларускага народу?! Што з яе праз гэткі польскі фільтр можэ дайсьці да галоў будучых грамадзян Краю? Нейкіе крошкі, адпадкі, рызьзё.. Дый толькі.

Кожная народная школа—француская, ці нямецкая, італьянская або гішпанская вучыць дзяцей аб мінуўшчыне роднага краю і народу. Толькі ў нас—на Беларусі—справа гэта стаіць зусім інакш. У нас дзіця даведываецца аб сваім краю і сваім народзі ў самым канцы, прыпадкам, крадучыся і хаваючыся, або неяк мімаходам... А як-жэ часта выклад „Гісторыі Польшчы“ ў народнай школе на Беларусі служыць дзеля таго, каб паганьбіць свой уласны народ і край, знесьлаўціць яго мінуўшчыну і т. д.? Facta, non ficta. Пасьля такой навукі у сям'і, дзе часам німа куска хлеба і чэравікі зношываюцца да канца, часта пад уплывам цёмнай, дурной, брыдзячайся ўсім сваім маткі зьберажоные цяжкай працай маркі аддаюцца на конфэдэратку, «ożełk» для сынка, — або ў кватэры нейкага

Максім Гарэцкі.

АНТОН

(Абразы жыцьця).

(Гл. «Гоман» № 28).

XI.

Упокой, Господзі, души усопшихъ раб твоихъ...

Цямніць... У Жабона каля хаты, пад вакном, заткнутым анучкаю, стаіць царкоўны стары крыж і падраная старая пратэса. Каля хаты і ў хаці гоман. У хаці пахніць мертвяком і воскам. На лаўцы ляжыць прыбраны Іванька с чорнаю наміткаю на галаве і з венчыкам паверх яе на лобе. Псалтыр чытаюць вучанічкі земскай школкі памеранку. Бабы сідзяць, ходзяць, моляцца, плачуць. Домну унімаюць, хворай Ходачцы бліноў даюць,—ня есць,—ды вады падносюць. Хаўтуры... мужыкі хаўтуры...

ЧЫТАКА. Упокой, Господзі, душу новопрестаўленнаго раба Твоего Іоанна...(папраўляецца) ...младенца Іоанна, идѣже нѣсть болѣзни, печаль...

ДОМНА. (выблаcя з духу, пакуль прышла, цяпер ад гора зайшлася, прыпадзець да ножак сына і выць)

А май ж ты, дзіцятычка,
Куды ж ты процiў ночачкі выбраўся,
Не пашкадаваў жэ нас твой татачка,
А Бог жэ сьвяты ведаіць, што ён меў
на ўме...

СУСЕДКА. Ну дос, дос, мая кумачка.

ЧЫТАКА. Блаженъ мужъ, иже не иде на совѣтъ нечестивыхъ и на пути грѣшныхъ не ста, і на сѣдалищѣ губителей не сѣде...

ДОМНА (ізноў).

А цяпер жэ аб нас людзячкі будуць
судзіць і гаварыць,
А гдзе ж яны былі, чаго маўчалі раней таго...

БАБУЛЬКА (скрыпіць). О-о, людзюхны... хацела б ты, лябёдка... Цяпер і радня—балевацъ хоць да-дня, а як ня пір, дык хоць ты ў вір... Людзюхны.

ДОМНА.

А мой жэ ты зязюлёк,
А мая пралесачка кволая,
Сыночак даражэнькі,
А я ж цабе выхварэла, вымаліла,
Пад сэрцам насіла, Бога прасіла...
Цяпер жэ ты, мая ягадка недасьпелая,
Адкацілася ж ты без пары...

БАБУЛЬКІ. А ведама, праведные душачкі й Богу ўгодны... К нам во старым ішла б ты, смертухна-матухна, дык не...

ДОМНА. (хліпочыць с сударгамі)

Хто ж цябе там будзе прыгльдацъ,
Да каго ж ты там прыхінешся,
А што ж гэта твой татачка задумаў,
А ці жівенік ён сам тамыцька,
Ці за сыночкам пайшоў?..
Бог жэ сьвяты ведаіць яго,
А за гэта мне Бог паслаў,
А баліць-ломіць мая галовачка,
А што дзеіцца, а што будзіць, а-я-ай...
(ажно хістаіцца ад плачу).

СУСЕДКІ. (адводзяць ае). Ну дос, дос, кумачка, Домначка, родненькая, Богу малі ся лягчэй яго душачцы будзе ад матачкі Атправацца... Даволі, досыць... Ах, Божа наш, Божа наш... Усякай матцы гора ды гора; то дзетачак вынасі, выхварай, то іх узгадуй, сілачку накладзі, ато яны у сьвет пойдуць, на нас забудуцца... Гдзе там... Ну хадзі ж ты, кумачка, выпі во вады, ну пакінь плакаць, родненькая... (Домна плачыць і ламаіць рукі, суседкі хліпаюць).

У ПАРОЗІ ПАЦІХУ. Стары Аўтух у мясьцечка кінуўся... На аблаві быў... — Ах, ах, добра што яму адразу ўсяго не сказалі кажуць, застраліцца хацеў, як дачуўся... — Ня можэ быць, не такі чэлавек, камень... — А наўрад ці выжывіць Антон, усё горла перашмуляў... на адным храпчыку засталося... — Дактары зашылі; о, брат, узяліся, паненка запіску прыслала... — Якіе дактары? Главнага німа, паехаў у госьці; адзін хвэльчар... — І што тая запіска, крыві сьцякло многа... А яшчэ каб ён маўчаў, ато пачанець гаварыць, а горла... дзірка... рана расчыніцца, разьзявіцца, дык яму ня можна дыхаць... — пакуль хлопцы дадуміліся прывязаць галаву цясёмкамі пад пахі, ато, загаворыцца, а галава кідзёх! ад'едзіць, — дзірка вялікая... — Уй! — Толькі кроў адтуль точыць і точыць... — Касою... А-я-я...

(Далей будзе).

стоража —' юка, ламаючы язык «po polskiemu», разлегаецца «Boże coś Polskę» або «Warszawianka». I беднае, абаламучэнае дзіця пачынае пагарджаць і стыдацца ўсяго сапраўдзі роднага, краёвага, свайго...

Зачэпляючы гэту палючую справу жыцьця Беларусі, мы на першым мейсцы стаўляем ня гэтульку выкладовую мому, сколькі самы зьмест выкладу гісторыі.

Ці доўга йшчэ гэткая ненормальнасць будзе ў нас лічыцца за нормальны і звычайны стан?!

Ад. С.

Аб наш правопіс.

Справа беларускага правопісу —гэта адна з найбольш пільных спраў нашага жыцьця. Асабліва-ж важна яна ня гэтулькі дзеля нашых публіцыстаў і літэратараў, сколькі дзеля пэдагогаў і аўтараў школьных кніжэк: пры навуцы дзяцей мала загадаць пісаць так, або сяк, а трэба вытлумачыць у зразумелай форме, чаму пішэцца гэтак, а не іначэй.

З гэтай-то прычыны перш за ўсё трэба устанавіць аснаўные прынцыпы правопісу, а тады ўжо перэхадзіць да падробнасьцей.

Гэтым прынцыпам, відаць, кіраваўся і паважаны працаўнік менскай беларускай часопісі „Вольная Беларусь“, п. Я. Л—к, пішучы сваю стацьцю ў № 4 пад загалоўком: „Наш правопіс“. У ўступленьні ён зусім правільна кажэ, што „трэба пісаць так, як чуеш“, ды гэта кладзе у аснову сваіх вывадаў. Аднак, у далейшым развіцьці гэтага прынцыпу ён робіць вялікі пераскок: не даўшы аснаўных адзнак беларускай фонэтыкі, гаворыць зразу аб адступленьнях ад яе. I гэта абмылка мсьціцца на ім ажно да канца.

У першай спробе даць правілы беларускага правапісьма («Як правільва пісаць па беларуску», Вільня, 1917), пішучый гэтые словы установіў два аснаўные правілы так-званага «ӓканьня»: безакцэнтнае *о* акае заўсёды; безакцэнтнае *е* — толькі тады, калі акцэнт перайшоў з яго на чародны за ім склад, дый то не заўсёды, а толькі тады, калі ў тым складзе німа зыку *а*. I, апіраючыся на гэтым, усе далейшые падробнасьці укладаюцца у стройную лёгічную цэласць і даюцца лёгка вытлумачыць. Тварэц правопісу менчукоў пераходзіць проста да падробнасьцей, і шмат правіл яго нельга вытлумачыць іначэй, як толькі жаданьнем норміроўкі беларускай вымовы без устанаўленьня норм. I мы пяройдзем да разгляду паадзінокіх правіл п. Я. Л—ка, выкладзеных у 17 пунктах.

§ 1. С-паміж трох форм адказу: *не*, *ня* і *ні* ён выбраў апошнюю: *ні*. На чым аснован гэты выбар, нельга дагадацца, бо-ж тое, што па нямецку кажуць: «nicht», ня можэ быць сур'ёзным аргумэнтам. Наадварот, у жывой беларускай мове аснаўная форма адказу ёсць *не*, і беларус, даючы на пытаньне адмоўны адказ, скажэ зусім выразна «*не*» (nein) і ніколі не ўжые ў такім кароткім звароці «*ні*». «Не» можэ зьменяцца ў «*ня*» або «*ні*» толькі у звязку с чародным словам, і ні аднэй ні другой прыпадковай адмены нельга прынімаць за аснаўную форму, хоць аднароднасць вельмі вабіць.

§ 2. Вельмі дзіўнае і незразумелае правіло пісаньня канчароў іменьнікаў з мягкім удваеньнем канцавога сугалоснага: „жыцьцё“, „вясельле“ — пры запісах кірыліцай. Адзначываючы, што мягкасць тут становіць аснаўную адзнаку беларускай мовы, аўтар, аднак, сам жэ заціpae гэту адзнаку, пішучы: „жыццё“ замест „жыцьце“, „вяселле“ замест „вясельле“ і т. д., а ў той жэ час пішэ: „ісьці“, „аднастайнасьцю“.

§ 3. Канчары для іменьнікаў сярэдняга роду без ударэньня устанаўліваюцца *о* і *э*. Пры гэтым *о* зусім неўспадзеўкі заменяе цьвёрдае *э*: замест мор*э* — мор*о*, замест гор*э*—гор*о*, хаця пастаноўка ў адным слове двух *о* для беларускай мовы зусім незвычайна! Што датычэ *е*, дык паскольку яно намейсцу ў славах поле, заданьне, пастольку не адпаведно ў слове полыме (значыць, і іме, племе, семе і інш.): словы с канцавым *м* у беларускай мове, падобне як і ў вялікарускай, становяць асобную групу і адменяюцца паводлуг асобнай адмены, значыць, іх нельга падганяць пад адно правіла с такімі славамі, як поле, заданьне і інш.

Правільна толькі кажэ п. Я. Л—к, што ў чыньніках сярэдні род трэба адзначываць канчаром *о*.

§ 4. Дзіўным выдаецца, чаму аўтар пішэ: чытае, гуляе, але: піша, гавора. Выключэньне дзеля ӓканьня ў чыньніках у канчарох пасьля шыпяшчых і *р* нічым у яго не абасновано.

§ 5. Ужываньне канчароў другога прыпадку прыметнікаў *ога* і *аго*—так сама не абасновано. Ад таго, чы акцэнт будзе на перадапошнім складзе, чы далей ад канца, ӓканьне безударнага *о* не зьменяецца.

§ 6. С прычыны таго што *е пасьля* ударнага складу не выяўляе тэндэнціі да аканьня, мы думаем, што канчары у 1 прыпадку множнага чысла у прыметніках усіх родаў лепей пісаць на *е*, чым на *а*.

§§ 7—13. Пагляды п. Я. Л—ка тут зусім правільные, і мы зусім з імі годзімся. Толькі ў § 11 ўводзіцца за агульнае правіла тое, што становіць вынятак толькі для мужчынскага роду, дый, наагул, само сабой адчуваецца.

§ 14. С прычыны невыясьненьня аўтарам асноў аканьня зыку *е* ён зусім неправільна трэбуе пісаць заўсёды *прад*-і *пера*; тым часам яны падлегаюць агульнаму правілу „ӓканьня“, і з гэтай прычыны трэба пісаць: прэдстаўнік і прадмова; перэдаць і перанесьці.

§ 15 дае лішнюю волю ў пісаньні такіх слоў: мяне і міне, яшчэ і ішчэ, пяпер і ціпер.

§§ 16 і 17 — ізноў зусім правільные.

У канцы—маленькая увага.

Менчукі пішуць: дзяржава, вылажана і т. п., стаўлючы побач некалькі шырокіх *а* ў тых складах, дзе, паводлуг паменёнага намі ў пачатку правіла ӓканьня, павінно быць больш вузкое *е*. Трэба пісаць: дзержава (—ад дзержаць), вылажэна (як зроблена) і т. д.

Наагул, адзначым, што краса беларускай мовы—у яе стройнасьці і пасьледавацельнасьці будовы; узвядзеньне на становішчэ агульнага правіла тэй ці іншай асаблівасьці, спатыкапай у паадзінокіх прыпадках, можэ пашкодзіць правільнаму развіцьцю нашай літэратурнай мовы. З гэтай прычыны, вітаючы кожную спробу норміроўкі правіл беларускага правопісу, мы асьцерэгаем працаўнікоў на гэтай ніве, каб не сьпяшылі закоўваць мову нашу ў тые або іншые штучные рамкі, ня выясьніўшы перш асноў беларускай фонэтыкі і тэндэнцій яе.

А. Луцкевіч.

У Вільні і ваколіцах.

× **Беларускі камітэт пом. пац. ад вайны** за месяц марэц выдаў дармовых абедаў 3237 на сумму 453 м. 4 ф. У тым ліку праз Беларускую Народную Страўню—2368 абедаў і праз іншые страўні—868.

Абеды выдаюцца перэважна бедным дзецям.

× **Гадаўшчына.** 6 красавіка, год таму назад, Амэрыка аб'явіла цэнтральным дзержавам вайну.

× **Назначэньне.** Фэльдмаршалак Эйхгорн, каторы пражыў у нашым месьці больш за 2 гады, назначэн за глаўнакамандуючага нямецкіх войск у Украіне і пераехаў на жыцьцё ў Кіеў.

× **Летні час.** 15 красавіка ўводзіцца так званы летні час. Ад гэтага дня крамы могуць быць адчынены да 8 гадз. Сьвятло можэ ў іх гарэць да 8 г. 15 м.

× **Канец тузіна.** Мэтрычная сыстэма дайшла новай пабеды: ў новым нямецкім таможэнным тарыфе выключэно паняцьце тузіна і заменено дзесяткам. Гэтак сама выключэн рахунак на „грошы“ (12 тузінаў). Капа асталася, аднак называецца „шэсць дзесяткоў“.

× **Контроль на мастох.** Stadthauptmann апавешчае, што пераходзячы цераз масты публіка павінна хаваць квіты аб заплочэным мастовым падатку і, зышоўшы з мосту, паказваць кантралерам. Хто гэтага ня зробіць, таго ня пусьцяць зыйсьці з мосту.

× **Дармовые карты на хлеб** на месяц май выдаюцца жонкам запасных у Stadthauptmanna, III аддзел, пакой 143, (Домініканская 2) ад 8 да 12 гадз. і ад 4 да 7 гадзіны у гэткіе дні:

для 4	цыркулу	—	8 і 9	красавіка
„ 6	„	—	10	„
„ 7	„	—	11	„
„ 8	„	—	12 і 13	„
„ 1	„	—	15	„
„ 5	„	—	16	„
„ 3	„	—	17	„
„ 2	„	—	18	„

Хто ня возьме сваіх карт у гэтые дні, можэ ўзяць іх яшчэ 19 і 20. Карты даюць права ня толькі на безплатны хлеб, але і на бульбу і іншые прадукты, калі іх будуць раздаваць.

× **Стрыжка авец.** Начальнік ваеннага упраўленьня Літаўэн апавешчае, што і гэтай вясной абязацельна стрыжка авец, Нячышчэная воўна павінна быць аддадзена нямецкім уласьцям за плату 2 маркі за фунт. Воўна з восеннай стрыжкі астаецца ў гаспадароў.

× **Спробы самагубства.** А. Лебіч, 20 г., дзеля самагубства напілася сублімату. Адратавала яе скорая помач.

У гасьцініцы „Чыкаго“ (Субоч 12) простытутка Язэпа Х. (20 гад.) дзеля самагубства напілася сублімату. Ратавала яе скорая помач.

× **На вуліцы.** Роха Пун, упаўшы па Жыдоўскай вул., зламала сабе нагу. У карэтцы скор. пом. адвезьлі яе ў Жыдоўскую бальніцу.

× **Пажар.** 3 красавіка а г. 10 веч. на таварнай станціі пачаўся пажар: ад іскры з лёкомотывы загарэліся 2 вагоны сена. Пажар згасіў Навагрудзкі аддзел пажарніцкай старожы.

× Тэмпэратура. Найвышэйшая і найніжэйшая тэмпэратура за апошніе дні была (па Цэльсію):

	найвыш.	найніж.
4 — 5	+ 7,5°	+ 3,5°
5 — 6	+ 15,7°	+ 3,6°
6 — 7	+ 15,5°	+ 5,4°
7 — 8	+ 15,5°	+ 3,8°

С пабыту на містэрыях.

27 і 30 марца у Палескай салі (Вароняя 5) і у Беларускім Клюбе (Сьв. Юрскі праспэкт 22) былі сыграны беларускіе вялікатыднёвые містэрыі. Містэрыі ставіліся Беларускім Т-вам Апекі над беднымі і бяздомнымі дзяцьмі „Золак“. Тэкст містэрый кіруючыся старымі одпісамі, апрацавала п. Ст. Корфф. Музыку да народных і рэлігійных тэкстоў дабраў і згарманізаваў, таксама карыстаючыся старымі тэкстамі містэрый, п. Дунаеў. Дзіцячы хор складаўся с 40 дзяцей.

Першая часць містэрый выяўляе сабой славяна-беларускі абрад сустрэчаньня вясны з абрадавымі паганскімі песьнямі і танцамі. У сам разгар малітвеннага настраеньня надходзяць першые весьці аб Хрысьце. Другі акт містэрый пераносіць віжа у Ерузалім, у аліўкавы сад, дзе Хрыстос моліцца да Бога Айца перад прыняцьцем цяжкіх мукі і аддаецца ў рукі збройнай таўпы, кіраванай фарызэямі.—Трэйці акт—то саля суда у Пілата.

Мяне найбольш уражала кемная ігра дзетак каторые укладалі ўсю сваю маладую душу у свае ролі. Песьні першага акту захватывалі арыгінальнымі і пекнымі народнымі мелёдыямі. Наагул, хор дзіцячы вывязаўся са свайго заданьня вельмі добра.

Бавіўшы часова ў Вільні і меўшы зручнасць пабываці на містэрыях, павязу ў Горадню ў душы гарачы ўспамін аб гэтым цікавым і веячым старадаўнасьцю тэатры якім некалькі сот гадоў таму назад сыцілі душы свае нашы прадзеды. I мне удзялілася частка таго цепла, якім былі сагрэты дзеці з грудзей сваіх кіраўнікоў, выпаўняючы свае ролі.

Т. Станішэўшчанка.

ВЕСТКІ З РАСЕІ.

БЭРЛІН. Шляхта Эстляндзіі паслала нямецкаму імпэратару тэлеграму, ў каторай між іншым гаворыцца:

„Высказываем глыбокую ўдзячнасць за вызваленьне ад векавой няволі. Эстляндзкая шляхта і земства маюць толькі адну надзею, што ім дадзена будзе магчымасць служыць Вашаму Вялічэству і вялікай нямецкай бацькаўшчыне.

ШТОКГОЛЬМ (В.Т.Б.). 6.IV. Фінляндзкая глаўная кватэра апавешчае 6.IV а 3 гадз. раніцай:

«Першая вялікая опэрація фінляндзкай арміі закончэна. Чырвоная гвардзія ў Таммэрфорсе паддалася».

ГЭЛЬСІНГФОРС. 30 марца нямецкае міністэрства загранічных спраў падало расейскаму ураду пратэст проці пасылкі падмогі чырвонай гвардзіі ў Фінляндзіі і зажадало ўзяцьця с Фінляндзіі і пакараньня расейскіх войск, грозячы іначэй выступленьнем.

ПЕЦЯРБУРГ. Расейскіе газэты —апрача тых, каторые стаяць за Троцкага,—спагадліва адносяцца да расейска-украінскіх перэгавораў. Нават газэты „Правда“ і „Ізвестія“ пішуць, што угоды між Украінай і Расеей можна будзе дайсьці тым хутчэй, чым хутчэй Расея адрачэцца мешацца да унутрэнных спраў Украіны і здаволіцца толькі фэдэрацыйнай рэспублікай.

ПЕЦЯРБУРГ. Некалькі зімаваўшых у Гангэ расейскіх ваенных судзён, у тым ліку 4 падводные лодкі, паўзрывалі сябе, каб не папасьці ў нямецкіе рукі.

ШТОКГОЛЬМ. Бальшэвіцкага ураду, як ядынага для ўсяе Вялікарасеі, больш німа. Масква і Пецярбург становяць незалежные адзін ад аднаго урадовые цэнтры. Ленін знаходзіцца ў Маскве і стаіць на чале чыстых большэвікоў, пагадзіўшыхся с падпісаным мірам. Троцкій у Пецярбурзі йдзе па сьлядох Керэнскага. Ен вызваў с Фінляндзіі паслоў Францііі Італіі, англіцкую і францускую ваенные міссіі і пры іх помачы організуе новую армію, мэта каторай—очывістая. Троцкій вядзе перэгаворы з Мілюковым, каторы са свайго боку адбыў нарады з адміралам Вердэрэвскім і англіцкім паслом Буканэнам. Галава правых соцыал-рэволюцыонераў, Чэрнов, гэтак сама радзіўся с Троцкім. Ясна, што Троцкій ладзіць саюз элемэнтаў, нездаволеных брэсцкай умовай, спадзяючыся разам з імі скінуць Леніна, пры помачы Лёндона і Парыжа утварыць новую

армію і сілай адваевацъ Балтыцкіе землі і Фінляндзію.

КОНСТАНТЫНОПОЛЬ. На каўказкім фронці заняты Сарыкамыш. Расейскіе банды прасьледуюцца ў кірунку Карсу. Турэцкіе войскі йдуць на Батум.

БЭРЛІН. Расейскі панцырны крэйсэр „Адмірал Макаров", збудаваны ў 1906 гаду 7.900 тонн з 10 цяжкімі гарматамі, наскочыў перад уходам у Рэвельскі порт на міну і затануў.

З усяго сьвету.

КЭЛЬН (В.Т.Б.). «Köln. Volksztg» трэбуе, каб выдатные польскіе агітатары заграніцай: Падэрэвскі, Дмоўскі, Сэйда і інш. не былі пушчэны пасьля вайны назад у бацькаўшчыну, бо іх работа заграніцай, варожая да цэнтральных дзержаў, у прыпадку павароту іх дамоў пашкодзіць добрым адносінам між Польшчай і гэтымі дзержавамі.

ТЭЛЕГРАМЫ.

Нямецкіе апавешчэньня:

5.IV. Заходні тэатр:

На поўдні ад Соммы і наабапал Моррэй мы ўчора пайшлі ў атаку і выкінулі ворагаў з іх сільных пазыцій. Контратака англіцкіх і францускіх рэзэрваў разбіта нашым агнём. Пасьля вострай бітвы мы здабылі Аммэль, лясістые абшары пры Вільле Брэтонэ, ды Кастэль і Майі. Ворагі аказалі вельмі сільны адпор. Мы ўзялі некалькі тысяч палонных. Усяго ўзято дагэтуль больш за 90.000 палонных і больш за 1.300 гармат.

У адказ на абстрэл Ляону мы абстрэлівалі Рэймс.

Пад Вэрдэнам крапчэла артылерыйская бітва.

Уходні тэатр:

На Украіне, на чыгунцы Палтава-Константыноград, мы ўзялі 28 вагонаў с францускімі стрэльбамі, патронамі і мільёнам артылерыйскіх гранат. Мы занялі Кацярынаслаў.

Азіяцкі тэатр.

Нямецкіе войскі разам з турэцкімі пасьля упорнай бітвы адкінулі англіцкіе войскі да Ёрдану.

6.IV. Уходні тэатр:

Мейсцовые опэрацыі пры Бокуа і на поўдні Іпітэрн далі палонных. Англіцкае наступленьне пры Пісье адбіто. На заходнім беразі Анкр, наабапал Альбэр, мы пашырылі нашы здабычы. Жалезнадарожные будоўлі пры Ам'ен абстрэляны. Францускіе штурмы між Моррэй і Мондідье адбіты с цяжкімі стратамі. Пад Вэрдэнам узмацавалася артылерыйская чыннасць.

7.IV. Заходні тэатр:

Паабедзі на полі баталіі узняліся вострые артылерыйскіе бітвы а пасьля іх сільные англіцкіе і францускіе штурмы пры Анкр і Авр. Густымі массамі штурмавалі англіцкіе палкі на поўдні ад Бомон-Амэль і наабапал Альбэр. Іх штурмы разбіты нашым агнём. Сьвежые францускіе дывізіі штурмавалі на заходнім беразі Авр, між Кастэль і Майі, на ўсходзі ад Торы, пры Канціні і 5 разоў пры Мэніль. У крывавых бітвах на штыкі іх атакі адбіты з вялізарнымі стратамі. Войскі генэрала ф. Бэм атакавалі ўчора раніцай варожые пазыцыі на заходнім беразі Уазы, пры Амэніль.

Мы дайшлі да лініі Башанкур—Отівіль—Барісі. Узяты больш за 1.400 палонных. На усходнім беразі Маасу пры Бомон узяты 70 палонных і 10 кулемётаў.

Ротмістр барон ф. Рыхтгофэн дайшоў сваей 76-й пабеды.

На македонскім тэатры ўзяты палонные французы, англічане і грэкі.

КАЛЯ ВАЙНЫ.

БЭРЛІН. Торговай палаце ў Эссэне ў адказ на прывітальную тэлеграму Гіндэнбург між іншым пісаў у тэлеграме:

Здарэньня апошняга часу паказалі, што наша пабеда—немінуча,—пабеда, каторая нам патрэбна дзеля забэспечэньня палітычнай і экономічнай будучыны Нямеччыны.

ЖЭНЕВА. Глаўнакамандуючый Фош сказаў англіцкім і францускім карэспандэнтам:

«Ад 30 марца мы задзержалі ворагаў, і наступленьне іх скончылося неўдачай».

ПАРЫЖ. Ад пачатку абстрэлу Парыжа з дальнабойнай гарматы забіты 85 асоб.

ЖЭНЕВА. Гранатай з дальнабойнай гарматы забіт у Парыжы генэрал Франкфорт.

Выезд жыхараў с Парыжа на палудзень трывае далей.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). Адна з нямецкіх падводных лодак затапіла між Францыей і Англіей 6 параходаў і 2 парусьнікі разам ёмкасьцю на 22.000 тонн.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). У заходняй часьці Сяродземнага мора нямецкіе падводные лодкі затапілі 7 параходаў і 13 парусьнікаў ёмкасьцю разам больш 25.000 тонн.

21 марца наша падводная лодка абстрэлявала італьянскі форт Цівіта Вэккя. Відаць былі пажары.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). Нямецкіе падводные лодкі ў поясе блокады навакол Англіі затапілі 6 параходаў ёмкасьцю разам 20.000 тонн.

ЛОНДОН. Англіцкае адміралцейство наказывае: 1 красавіка затануў англіцкі контрмінаносец.

Амэрыка і вайна.

ВАШЫНГТОН (Рэўтэр). 6.IV. На сьвяткаваньні гадаўшчыны аружнага выступленьня Амэрыкі Вільсон 6 красавіка сказаў у Бальтиморы вялікую прамову. Між іншым, ён сказаў:

«Гэта—гадаўшчына прыняцьця намі вызаву Нямеччыны біцца за свае права жыць вольна і за сьвятые правы мужчын усяго сьвету. Нацыя прабудзілася. Мы ведаем, што вайна будзе вымагаць ад нас найвялікшых ахвяр, — мо' ўсяго, што мы маем. Амэрыка можа быць цяпер зусім пераканана, што доля яе залежыць ад канца вайны. Калі вайна будзе праіграна, Амэрыка утраціць свае становішча вялікай нацыі і загубіць сваю сусьветную міссію. На нашы міравые прэдлажэньня нямецкіе валадары ясна адказалі, што яны дабіваюцца не праўды, а панаваньня і выпаўненьня сваей волі без прашкод. У Злучаных Штатах ніхто не сумлеваецца аб значэньні таго, што немцы зрабілі ў Расеі, Фінляндзіі, Украіне і Румыніі, — і яны зрабілі-бы тое самае на заходнім фронці, калі-б іх арміі не сустрэцілі там цьвёрдага адпору. Мэта ворагаў — бясспорная: гэта — падчыніць сваей волі і сваім амбіціям усе славянскіе народы і утварыць сусьветную дзержаву гвалту, эксплоатацыі і торговага панаваньня. З гэтай прычыны што нам астаецца? Я яшчэ і цяпер стаю за мір, каторы зраўнаваў-бы правы сільных і слабых. Але вызаў на дуэль і я і вы прынімаецє,—і ніхай аб гэтым ведае ўвесь сьвет, што ён прыняты. Нямеччына яшчэ раз даручыла развязку нашае спорки сіле. На гэта мы можамо даць толькі адзін адказ: адпор, адпор да апошняга, адпор бяз меры і бяз меж, адпор справядлівы і пабедны, каторы верне сілу сусьветнага права і зруйнуе ўселякае панаваньне.

«Wiln. Ztg.» с прычыны гэтай прамовы піша:

«Старым фразам Вільсона аб праўдзе і праве пярачыць выступленьне проці Голандзіі. Між яго славамі і дзеламі выяўляецца ўсё глыбейшая нязгодлівасць. Цяпер ён ясна паказвае, што значыць амэрыканская палітыка і палітыка саюзьнікаў Амэрыкі: гвалт над усім, што ім на сьвеці не паддаецца. Нямеччына ніколі не пазволіць узлажыць на сябе ярмо гвалту. Дзеля гэтага яна і вядзе сваю гэроічную барацьбу».

АБВЕСТКІ.

Друкавана у друкарні М. Кухты. Выдавецтва «Гоман.» Рэдактар Язэп Салавей.